Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«____» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2018

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту ОСВО 1-23 01 14-2013 Сацыяльна-культурная дзейнасць і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэг. № Е23-1-75/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. У. Рагачова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. У. Міцкевіч,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 30.05.2017);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

Адказны за выпуск: В. У. Рагачова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Методыка выкладання спецдысцыплін» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць. Прапанаваная праграма з’яўляецца лагічным працягненнем і паглыбленнем ведаў, атрыманых студэнтамі ў выніку авалодання такімі дысцыплінамі, як «Педагогіка і псіхалогія», «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» і інш.

Вучэбная дысцыпліна займае вядучае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Рэальнасць сучаснага сацыякультурнага працэсу характарызуецца цяжкімі і супрацьлеглымі тэндэнцыямі, якія патрабуюць глыбокага асэнсавання зместу блока прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Работа ў сферы «чалавек-чалавек» у кірунку сучаснай гуманістычнай канцэпцыі выхавання і адукацыі патрабуе адпаведнай унутранай псіхалагічнай падрыхтоўкі і педагагічнай кампетэнтнасці спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. У сувязі з гэтым вывучэнне праграмнага матэрыялу, дадатковай літаратуры, выкананне заданняў для самастойнай работы дае магчымасць студэнтам асвойваць тэарэтычныя асновы сучаснай методыкі выкладання, метады арганізацыі педагагічнага працэсу ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі; методыку падрыхтоўкі заняткаў; прыёмы навучання, замацавання і кантролю ведаў па прадметах сацыяльна-культурнага цыкла.

*Мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны – тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійна-выкладчыцкай дзейнасці ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміраваць у студэнтаў веды аб тэарэтычных і метадалагічных асновах сістэмы перадачы ведаў;

– даць будучаму спецыялісту веды аб дыдактычных прынцыпах, спосабах, агульных прыёмах і формах арганізацыі ву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэбна-выхаваўчага працэсу ў вучэбных установах рознага тыпу;

– раскрыць перад студэнтамі своеасаблівасць педагагічнай дзейнасці, спецыфіку розных форм выкладання спецдысцыплін;

– сфарміраваць у студэнтаў навыкі і ўменні выкладання спецдысцыплін.

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» вызначаны адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць», дзе акрэслены мінімум зместу па дысцыпліне ў выглядзе сістэмы абагульненых ведаў і навыкаў, ствараючых прафесійную кампетэнтнасць выпускніка УВА.

Студэнт павінен ***ведаць:***

– метады навучання, замацавання і кантролю на занятках па прадметах сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– агульнатэарэтычныя і метадалагічныя пытанні выкладання тэорыі і гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– педагагічныя аспекты эстэтычнага выхавання і мастацкай адукацыі асобы;

***умець:***

– праектаваць мэтавызначэнне педагагічнага працэсу і шляхі яго ўвасаблення на практыцы;

– планаваць змест і этапы рэалізацыі педагагічных і навукова-даследчых праектаў;

– ажыццяўляць эстэтычнае выхаванне і мастацкае развіццё вучняў у працэсе самастойнай педагагічнай дзейнасці;

– самастойна працаваць з навуковай і метадычнай літаратурай;

***валодаць:***

– методыкай распрацоўкі і правядзення заняткаў па дысцыплінах сацыяльна-культурнага цыкла;

– навыкамі аб’ектыўнай ацэнкі ведаў навучэнцаў;

– педагагічным майстэрствам.

Згодна патрабаванням адукацыйнага стандарту пасля завяршэння навучання ва ўстанове вышэйшай адукацыі спецыяліст сацыяльна-культурнай сферы павінен валодаць акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі. Акадэмічныя кампетэнцыі праяўляюцца ў авалоданні ўменнямі выка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстання базавых навукова-тэарэтычных ведаў для вырашэння тэарэтычных і практычных задач; авалоданні сістэмным аналізам. Патрабаванні да асобасных кампетэнцый мяркуюць фарміраванне здольнасцей да міжасобасных камунікацый, да сацыяльнага ўзаемадзеяння. Прафесійныя кампетэнцыі праяўляюцца ва ўменні ўключаць людзей у працэс бесперапыннай адукацыі, сацыяльна-культурнай творчасці; у набыцці новых ведаў, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае тэарэтычныя веды аб асноўных паняццях, змесце, метадах і формах сацыяльна-культурнай дзейнасці; асноўных дакументах, якія рэгламентуюць вучэбны і выхаваўчы працэс у адукацыйных установах Рэспублікі Беларусь; аб прынцыпах планавання вучэбнай дзейнасці. Практычная частка вучэбнай дысцыпліны разлічана на развіццё навыкаў самастойнай распрацоўкі студэнтамі лекцый, семінарскіх, практычных, лабараторных заняткаў, а таксама вучэбных праграм па дысцыплінах спецыяльнасці.

Згодна з мэтай і задачамі дадзенай дысцыпліны асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (часткова пошукавы і даследчыя метады); інтэрактыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, круглы стол, майстар-клас і інш.).

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» адведзена ўсяго 142 гадзіны, з іх 62 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 16, практычныя – 24, семінары – 22 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Методыка выкладання спецдысцыплін як вучэбная дысцыпліна, яе месца і роля ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны, яе асноўны змест. Структура вучэбнай дысцыпліны і яе вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Сістэма праверкі і ацэнкі ведаў па дысцыпліне.

### *Тэма 1. Асноўныя этапы і сучасныя тэндэнцыі развіцця сістэмы мастацкай адукацыі*

Зараджэнне і станаўленне сістэмы адукацыі на Захадзе; характарыстыка асноўных этапаў. Гісторыя зараджэння і станаўлення сістэмы мастацкай адукацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Сучасная сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

Асноўныя дакументы, рэгламентуючыя вучэбны і выхаваўчы працэсы ў адукацыйных установах Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя адукацыйныя стандарты вышэйшай прафесійнай адукацыі. Прынцыпы планавання вучэбнай дзейнасці. Структура і змест вучэбнага плана па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Блокі вучэбных дысцыплін і кампанентаў у вучэбным плане. Рабочы вучэбны план, тэматычны план, распісанне заняткаў.

### *Тэма 2. Віды і формы арганізацыі вучэбных заняткаў па спецыяльных дысцыплінах ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі*

Характарыстыка асноўных відаў і форм навучальных заняткаў. Роля лекцый у навучальным працэсе і іх класіфікацыя. Прынцыпы праектавання лекцыйнага курса: сістэмнасць, інфарматыўнасць, нагляднасць. Методыка падрыхтоўкі лекцыі па дысцыплінах спецыяльнасці. Семінар як форма вучэбных заняткаў. Віды семінарскіх заняткаў. Структура семінарскіх заняткаў. Практычныя заняткі як форма вучэбных заняткаў. Асаблівасці практычных заняткаў па дысцыплінах спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Віды практычных заняткаў. Асаблівасці выкарыстання лабараторнай працы як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы вучэбных заняткаў. Спецыфіка правядзення заняткаў ва ўстановах дадатковай адукацыі.

### *Тэма 3. Навукова-даследчая і самастойная работа навучэнцаў*

Мэты і задачы навукова-даследчай дзейнасці. Асноўныя формы навукова-даследчай дзейнасці навучэнцаў. Роля самастойнай работы ў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў. Віды самастойнай работы. Самастойная работа ў аўдыторыі (на лекцыі, пад кіраўніцтвам выкладчыка). Самастойная работа навучэнцаў па-за межамі аўдыторыі.

Агульнае прадстаўленне аб курсавых і дыпломных работах па дысцыплінах спецыяльнасці. Навуковае кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі. Структура і змест курсавых і дыпломных работ. Афармленне і абарона курсавых і дыпломных работ.

### *Тэма 4. Віды і формы кантролю ведаў у працэсе навучання*

Паняцце і функцыі кантролю ведаў. Асноўныя прынцыпы праверкі і ацэнкі ведаў. Віды атэстацыі (бягучая, выніковая). Віды і формы праверкі ведаў па дысцыплінах спецыяльнасці. Распрацоўка крытэрыяў ацэнкі ведаў студэнтаў. Асаблівасці выкарыстання бальна-рэйтынгавай сістэмы ацэнкі ведаў. Тэставы кантроль ведаў і яго дыдактычныя функцыі.

### *Тэма 5. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у выкладанні спецдысцыплін*

Асноўныя і дапамагаючыя сродкі ў выкладанні спецдысцыплін. Тэхнічныя сродкі навучання і іх роля ў выкладанні дысцыплін спецыяльнасці. Інфармацыйныя тэхнічныя сродкі (відэаапаратура, аўдыяапаратура, праекцыйная апаратура). Кантралюючыя тэхнічныя сродкі.

### *Тэма 6. Прафесійная падрыхтоўка і дзейнасць выкладчыка спецдысцыплін*

Асноўная метадычная дакументацыя на кафедры (пратаколы пасяджэнняў кафедры, вучэбны план спецыяльнасці, рабочы вучэбны план кафедры, план спецыялізацый, тэматыка курсавых і дыпломных работ, вучэбныя і рабочыя праграмы курсаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбна-метадычныя комплексы, вучэбныя дапаможнікі, метадычная літаратура). Праца прадметна-метадычных камісій, секцый, аб’яднанняў.

Падрыхтоўка выкладчыкаў дысцыплін спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы.

Прафесійная кампетэнтнасць. Прафесійная дэфармацыя асобы: паняцце, сутнасць і змест. Фактары прафесійнай дзейнасці, якія ўплываюць на асобу і яе праяўленне. Асноўныя праяўленні прафесійнай дэфармацыі асобы выкладчыка. Характарыстыка шляхоў папярэджання і пераадолення негатыўнай прафесійнай дэфармацыі асобы выкладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Кіруемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| 1 | Уводзіны. Асноўныя этапы і сучасныя тэндэнцыі развіцця мастацкай адукацыі | 2 | 4 | 4 | | |
| 2 | Віды і формы арганізацыі вучэбных заняткаў па спецыяльных дысцыплінах ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі | 4 | 4 | 4 | 2 | вуснае апытанне |
| 3 | Навукова-даследчая і самастойная работа навучэнцаў | 2 | 2 | 4 | 4 | абарона рэфератаў |
| 4 | Віды і формы кантролю ведаў у працэсе навучання | 2 | 2 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| 5 | Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у выкладанні спецдысцыплін | 2 | 2 | 2 | | |
| 6 | Прафесійная падрыхтоўка і дзейнасць выкладчыка спецдысцыплін | 2 | 4 | 4 | 4 | круглы стол |
| | **Усяго…** | **14** | **18** | **20** | **12** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Кругликов, Г. И.* Методика профессионального обучения с практикумом : учеб. пособие для студентов / И. Кругликов. – М. : Академия, 2005. – 288 с.

2. *Мищенко, А. И.* Введение в педагогическую профессию / А. И. Мищенко. – Новосибирск, 1991. – 146 с.

3. *Никитина, Н. Н.* Основы профессионально-педагогической деятельности / Н. Н. Никитина [и др.]. – М. : Мастерство, 2002. – 288 с.

4. *Пидкасистый, П. И.* Психолого-дидактический справочник преподавателей высшей школы / П. И. Пидкасистый, Л. М. Фридман, М. Г. Гарунов. – М. : Педагогическое общество России, 1999. – 354 с.

5. *Пионова, Р. С.* Педагогика высшей школы : учеб. пособие / Р. С. Пионова. – Минск : Выш. шк., 2005. – 303 с.

*Дадатковая*

1. *Аванесов, В. С.* Форма тестовых заданий : учеб. пособие для учителей школ, лицеев, преподавателей вузов и колледжей / В. С. Аванесов. – 2-е изд., перераб. и расш. – М., 2005. – 156 с.

2. *Левина, М. М.* Технологии профессионального педагогического образования : учеб. пособие для пед. вузов / М. М. Левина ; Междунар. акад. наук пед. обр. – М. : Академия, 2001. – С. 152–160.

3. Педагогический практикум по курсу «Педагогическое мастерство воспитателя» / Могилев. гос. пед. ин-т. – Могилев : МГПИ, 1997. – 40 с.

4. Профессиональная педагогика / С. Я. Батышев, Б. С. Гершунский [и др.]. – 2-е изд. – М. : Эгвес, 1999. – 902 с.

5. *Селевко, К.* Современные образовательные технологии : учеб. пособие / К. Селевко. – М. : Нар. образование, 1998. – 256 с.

6. *Сластенин, В. А.* Педагогика : учеб. пособие для студентов педагогических учебных заведений / В. А. Сластенин [и др.]. – М. : Школа-Пресс, 2002. – 512 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Смирнов, С. Д.* Педагогика и психология высшего образования: от деятельности к личности : учеб. пособие / С. Д. Смирнов. – М. : Академия, 2003. – 304 с.
8. *Щуркова, Н. Е.* Практикум по педагогической технологии / Н. Е. Щуркова. – М., 2001. – 249 с.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, якія мае рознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па дысцыпліне «Методыка выкладання спецдысцыплін» могуць выкарыстоўвацца вусныя апытанні падчас заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах дысцыпліны і выступленне студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках з распрацаванымі імі ўрокамі.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендавана выкарыстанне праблемных, творчых заданняў (напрыклад, распрацоўка і прадстаўленне на практычных занятках частак альбо паўнаважных урокаў).

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца часткай вучэбнай дзейнасці і мае мэтай замацаванне і паглыбленне атрыманых ведаў і навыкаў, самастойны пошук і набыццё новых ведаў. Яна арыентавана на фарміраванне навыкаў самастойнай працы ў вучэбнай, навуковай, прафесійнай дзейнасці.

Самастойная работа студэнтаў уключае работу з лекцыйным матэрыялам, нарматыўна-прававымі і вучэбна-метадычнымі дакументамі, пошук і аналіз дадатковай літаратуры па тэмах вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне тэм, вынесеных на самастойную падрыхтоўку, а таксама выкананне вучэбных заданняў, падрыхтоўку да семінарскіх і практычных заняткаў і іспыту па дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладны пералік заданняў
## для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

1. Праца з канспектам лекцый і літаратурай па вучэбнай дысцыпліне.

2. Падрыхтоўка мультымедыйных матэрыялаў да дакладаў і рэфератаў.

3. Пошук і адбор педагагічных тэхналогій для правядзення пробных заняткаў.

4. Падрыхтоўка да выканання дыягнастычных форм кантролю (вусных і пісьмовых апытанняў, тэстаў і інш.).

5. Падрыхтоўка да ўдзелу ў рабоце круглых сталоў.

6. Падрыхтоўка рэфератаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| № п/п | Дата | Дапаўненні і змяненні | Падстава | Прозвішча, імя, імя па бацьку загадчыка кафедры, подпіс | № пратакола пасяджэння кафедры, дата |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



14

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,41. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ